ГОВАР
ГЕНАДЗЬ

# Вершы і малюнкі

ЖЛОБІН
1998

Кіно нас сапсавала. Аб'ект нашай увагі не існуе па-за руху. Бег ва ўсім. Мо ў тым адна з прычын бездухоўнасці, што ў спыненых імгненнях мы перасталі бачыць прыгожае, а тым больш спасцігаць у іх глыбіню сутнасці быцця?..

У вашых руках твор, у якім сінтэз вершаў і графікі ўяўляе сабой унікальную форму – накшталт павелічальнага шкла. Праз яго разглядаецца шматаблічны сусвет і чалавек у ім. Пры гэтым кожнае чатырохрадкоўе – як згустак думак і пачуццяў паэта – нагадвае ўсходнія рубаі. А графічныя кампазіцы сваімі вобразамі падобны на сімвалы, пакінутыя продкамі на мураваных скрыжалях.

Сувязь часоў адлюстроўваецца тут не столькі ў падабенстве формы, колькі ў філасафічнасці зместу. Аўтара турбуюць спрадвечныя пытанні зместу жыцця. І ён вырашае іх як творца рэнесанснага складу, як мастак з беларускай душой.

Ужо сама яскравая, сакавітая беларуская мова, якой валодае аўтар, нараджае ў чытача пачуццё нацыянальнай гордасці.

Чалавек у храме Прыроды паўстае не здрабнелы і збянтэжаны, а велічны ў пошуках свайго прызначэння. Бо і Прырода ўяўляецца беларусу то магутнай і неабсяжнай, то ўтульнай і ласкавай – быццам Маці, якая спачувае свайму сыну.

Паэзія і графіка тут у гарманічным адзінстве. Узаемна дапаўняючы і развіваючы адна адну, яны ствараюць змест аб'ёмным, галаграфічным. Ключом для адкрыцця шматпластовага сэнсу служаць вершы-разважанні.

" Асэнсаванне часу", – так назваў аўтар серыю афортаў, толькі незначная частка якіх увайшла ў мастацкае афармленне гэтага выдання. У кожным творы Час паўстае



масштабна і канкрэтна. Такім яго робіць не проста вобраз чалавека, які праходзшць скрозь усе эпохі, а вобраз менавіта сучасніка, суайчынніка, усхваляванага падзеямі ў грамадстве. У жыццёлюбівыя інтанацыі твораў Чарнобыль дадае смутак, горыч, аўтарскую боль і асаблівую вастрыню.

Цалкам гэта кампазіцыя мае публіцыстычны характар, але яна не для газеты-аднадзёнкі. Філасафічнае пераплецённе графікі і вершаў бясконцае, як бясконцае само жыццё, як бязмежны патэнцыял аўтара, рамантыка і рэаліста.

Кожнага хто ведае члена Саюза мастакоў Беларусі гамельчаніна Генадзя Васільевіча Говара, здзіўляе дыяпазон яго творчасці: жывапіс, акварэлі, пастэлі, малюнкі, афорты, экслібрысы, карыкатуры, плакаты... Разнастайныя па тэма-тыцы, гэтыя работы не толькі даюць эстэтычнае задавальненне, але і ўзбагачаюць свежым светапазнаннем, запальваюць уяўленне, заахвочваюць д у м а ц ь.

Шматгранная дзейнасць дыктуе напружаны жыццёвы рытм. Захоплены ім Генадзь Говар усе праблемы ўспрымае дзелавіта, без надрыву, не губляючы ўнутранага спакою. Такім можа быць толькі чалавек, які ўпэўнены ў сваіх сілах, у здзяйсненні сваіх планаў. Які даражыць кожным імгненнем жыцця і ўсей сваей творчасцю заклікае і нас да гэтага.

Прыпынімся. Разгледзім. Прачытаем. Задумаемся.

**Алег Ананьеў**


Мой смутак – сённяшні набытак,
Цяжкі, як колас спелы жыта...
Душа, ці знойдзеш мрой прытулак?
На сумакой – верш і малюнак

* * *

***Недасягальнасць мэты прадказальна,***
***І згуба часу ўжо недаравальна.***
***Натхняе, вабіць і карціць...***
***Задуму ўраз ажыццявіць.***

* * *

***Талент цягнецца бляскам да таленга,***
***Чым адлегласць бліжэй, тым ярчэй,***
***Зіхацяць, нібы промні дыямента,***
***І становіцца людзям віднеей...***

* * *

***Якое гэта захапленне !***
***Жыцця шчаслівыя імгненні***
***У фарбах, словах перадаць,***
***Сваім імпэтам зараджаць…***



* * *

***Словы забытыя поўняцца сэнсам.,***
***Продкаў маўклівых пульсіруюць гены,***
***Вершам узнёслым сам-насам ліецца,***
***Дух мой раскуты, ад шор непісьменны…***

* * *

***Паэтаў шмат, а слоў усім хапае,***
***І двух аднолькавых паэтаў не бывае.***
***Як не бывае падабенства золкаў,***
***У кожнага паэта – свая зорка.***

* * *

***Мае абпаленыя крылы***
***Яшчэ трымаюць. Наш абшар***
***Такі журботны і панылы,***
***Спаліў чарнобыльскі ліхтар...***


Мастак узнёсла, як набытак,
На палатне зрабіў адбітак.
Але канец – заўжды пачатак,
Натхнення новага глыток...

* * *

*Рух  повальны  і  погляд  уважлівы,*
*Нібы  рысь  выбірае  ахвяру ...*
*На  паперы  алоўкам  развважлівым*
*Занатоўваю  думкі  і  мары...*

* * *

*Натхненне  з  белым  палатном*
*Зрабіла  цуд.  Гарыць  вясёлка.*
*І  травы,  кветкі,  матылі  –*
*Усё зіхаціць  у  промнях  золка.*

* * *

*Такія  розныя  –  Паэт  і  Хлебароб,*
*А  вынік,  як  ні  дзіўна,  у  іх  адзін,*
*Без  добрай песні  й  хлеб  не  люб,*
*Без  хлеба  ж  песня,  як  палын...*



* * *

*Яшчэ  не  страчана  цікаўнасць,*
*Хоць  марна  страціў  часу  шмат,*
*І  не  такая  ўжо  рухавасць,*
*І  чым  далей,  тым  болей  страт...*

* * *

*Па  кропельцы  зліваюцца  пратокі,*
*Па  каліўцу  складаюцца  стагі,*
*Па  зернейку  збіраюцца  хлябы,*
*Па  літарцы  з'яўляюцца  паэты...*

* * *

*Неверагодная  актыўнасць.*
*Як  на  апошняй стомятроуцы.*
*Чарнобля радыеактыўнасць*
*Мяне  прыспешвае  паспець...*


Зямля прыцягвая ўсё
І нас, таксама, далучае.
Мы пэўны час нібы дзіцё...
Але жыццё, як сон, мінае...

* * *

***Палёта стан адчуць магчыма***
***У каханні, мроях -летуценнях,***
***Калі здзіўляе свет Айчына,***
***У сваіх уздымах і падзеннях...***

* * *

***Ад адзіноты лечыць талака,***
***Ад раздражнення гурту – адзінота.***
***Жыццё людское плынню, як рака,***
***Да стромы лашчыцца і да балота...***

* * *

***Ісці да запаветнай мэты ?***
***Сцяжынай вузкай ? Бальшаком ?***
***Наўкол, як цені, сілуэты,***
***Хто наўцянькі ... Хто напралом...***



* * *

***Яно, вядома, і цікава***
***У цемры бавіцца рухава,***
***Але такі антаганізм***
***Ушчэнт знішчае рэалізм…***

* * *

***А хто там ідзе ?. . Без адказу пытанне ...***
***А што з намі будзе ?. . Мы будзем заўжды.***
***Як тое пытанне –***
***«А хто там ідзе ?...»***

* * *

***Будучыня – гэта меркаванне,***
***Сённяшнім жыццём ахвяраванне.***
***Што наканавана – тое будзе ...***
***Як ні мяркуй , як ні плануй ...***


Добра там, дзе нас няма.
Не віхурыць там зіма.
Увесь час красуе лета...
Мо таму, што нас няма?...

* * *

***Почка трэсне – і лісцік на волю,***
***Зелянінай сваёй уварвецца,***
***Затрапеча за лепшую долю,***
***Абзалоціцца і абарвецца...***

* * *

***У крыніцу не носяць вадзіцу***
***І дабра ад добра не шукаюць.***
***Ты трымай лепей моцна сініцу,***
***Журавы ў сінім небе лятаюць...***

* * *

***Мутарна жвavаму марыць,***
***Марна ўзнёсламу блазіць.***
***Кожны сваё заўважыць,***
***Зробіць свае лепш за іншых...***



* * *

***Да разуму мана не ліпне,***
***Хлусня абыдзе інтэлект,***
***І путы зблытаўшы ўшчэнт,***
***Сама стыножыцца і знікне..***

* * *

***Жыццё – імгненне, больш нічога,***
***Яно нам дадзена ад Бога.,***
***І след халодны ці гарачы***
***Пакіне кожны на Зямлі...***

* * *

***Час застаецца, Час бясконцы,***
***Ён не праходзіць, не цячэ,***
***Праходзім мы праз промні сонца,***
***І ўжо не вернемся яшчэ...***


Капыт, як кіпцюр, не завострыш,
І кіпцюр, як капыт, не затупіш.
Ад травы траваядны залежны.
Ад яго, адпаведна, драпежны...

* * *

*Па – воўчы выць з ваўкамі ў зграі,*
*Бляяць баранам у атары,*
*Але не блытай, бо ў зграі,*
*Бляяць не трэба – трэба выць...*

* * *

***Які пагляд – такі і накірунак,***
***У кожнага ёсць свой шляхоў карунак,***
***Прасочыць Час уважліва малюнак,***
***І вызначыць, хто правы, а хто не...***

* * *

***Мы адчуваем штохвіліы,***
***Свой лёс жабрача - вераб'іны,***
***І колер жыцця нейкі шэры.***
***Навокал брамы, краты, дзверы...***



* * *

***Хто б мог дбаць аб той парусе,***
***Што адбылася ў хаўрусе ?..***
***І не спіць, не есць хаўрус,***
***Здзервянеўшы без прымус...***

* * *

***Будзе так, як заўсёды,***
***Будзе так, як заўжды,***
***Будзе хлеб смачней мёду,***
***Гора – лепш за бяды...***

* * *

***Зноў па бойнішчы рана - ралля,***
***Зноў тасуецца ўлад іерархія…***
***«Гэта наша спрадвеку зямля,***
***Гэта наша з тобой біяграфія!..»***


Хто бавіць Час, а хто палюе.
Хто дямантуе. Хто заціх.
Час уладарыць, Час кіруе,
Час усё прасее і ўсіх...

* * *

***Наш лёс журботны, партызанскі,***
***Маўклівы, ціхі, гаспадарскі –***
***На бойнішчы араць ды сеяць,***
***І зноў маркотна летуценіць...***

* * *

***Вясной, як заўсёды, заплачуць бярозы,***
***У шклянкі нальюць іх крыштальныя слёзы,***
***Ці памяць -гаркота?.. Ці слодыч вясны?..***
***Чарнобыля рэха – кактэйль ледзяны...***

* * *

***Па кропельцы разумныя шчыруюць,***
***І кропель тых хапае на ўсіх.***
***Яны нябачна душамі кіруюць,***
***І крок яднаючы, і ўздых...***



* * *

***Памежнікі між продкаў і нашчадкаў,***
***Мы час не лічым і нататкаў***
***Мінуўшчыны сівой не вучым,***
***Што нашай змене мы даручым ?..***

* * *

***Штогод адліга нам спрыяе,***
***Усё наноснае змывае***
***Ільду забруджанага шкло –***
***Душы сардэчнае цяпло...***

* * *

***Мы сёння ёсць, а заўтра – невядома...***
***Ці будзем мы ?.. Ці вернемся дадому ?..***
***Таму не адкладай магчымага на потым,***
***Хай пойдзе на карысць душы твоей уздым!***

* * *

***Думка - верш адаб'ецца па часе,***
***Пачуццё адгукнецца ў ім рэхам,***
***Зазіхціць, як прамень, у алмазе***
***Ці ўсмешкой, ці грэблівым смехам ...***

Мастак Генадзь говар нарадзіўся ў Жлобіне. Гэты непаўторны край стаў крыніцай натхнення яго творчасці. Майстра пэндзля, а Генадзь Говар быў прыняты ў Саюз мастакоў у 80-я гады, адчуў, што яму ёсць яшчэ нешта сказаць людзям не толькі фарбамі, але і паэтычным радком. І тады нарадзілся вершы, якія ён і выносіць на Ваш суд, дарагія чытачы. Жыве мастак і паэт Генадзь Говар у Гомелі.

Издательско-полиграфическое предприятие "Техническая книга",
247210, г. Жлобин, ул. Урицкого, 62.